УДК 882. 6

*П.І. Маляўка*

# ДУХОЎНЫ КАТАРСІС ДРАМАТЫЧНАГА ГЕРОЯ Ў П'ЕСЕ АЛЯКСЕЯ ДУДАРАВА «ПАРОГ»

У артыкуле цераз прызму мастацка-эстэтычнага светабачання аналізуюцца характары персанажаў п'есы Аляксея Дударава «Парог». Акцэнтуецца ўвага на іх ролі і месцы, асабліва галоўнага героя драмы, у працэсе духоўнага катарсісу на шляху да Чалавека сацыяльна-значымага і ўнутрана багатага.

Вельмі часта сучаснасць таго ці іншага твора атаясамліваецца з яго актуальнасцю, сацыяльнай значнасцю. А. Дудараў якраз і з'ўляецца пісьменнікам, які ў большасці сваіх твораў ставіць пытанні менавіта надзённага характару, сцвярджаючы неадкладную патрэбу іх вырашэння. Сур'ёзны роздум над складанымі заблытанымі пытаннямі, жыццёвымі рэаліямі, што выліваюцца ў творы ў канфліктныя сітуацыі, стаўся неад'емнай традыцыйнай рысай п'ес аднаго з самых вядомых прадстаўнікоў сучаснай беларускай драматургіі. Лепшыя творы А. Дударава прасякнуты актуальнымі ва ўсе часы маральна-этычнымі пошукамі. Ужо першая кніга пісьменніка, а менавіта апавяданні са зборніка «Святая птушка», а таксама п'есы «Радавыя», «Вечар» засведчылі, што аўтара іх найперш цікавіць працэс духоўнага катарсісу героя. Драма «Парог» – чарговая мастацка-эстэтычная мадэль рэчаіснасці, у якой найбольш поўна знайшла сваё адлюстраванне светапоглядная аўтарская пазіцыя – вера ў трываласць чалавечых каштоўнасцей, упэўненасць у тым, што справядлівасць, дабрыня, спагада заўсёды перамагаюць. Цікава, што аўтарская канцэпцыя рэалізуецца галоўным чынам праз вобраз Пакутовіча – персанаж унутрана дастаткова супярэчлівы. Само прозвішча яго, безумоўна, дае чытачу, гледачу пэўны ключ для ўваходжання ў сэнсавыя глыбіні твора. Пакутовіч, як і большасць герояў А. Дударава – складаная натура, якіх звычайна называюць ***чудзікамі.***

Незвычайна, нават дзіўна і непрымальна для многіх – заўсёды адчыненыя дзверы вашай хаты ці кватэры. Яны нібы запрашаюць кожнага зайсці, стацца новым госцем, не зважаючы на тое, хто ты ёсць – злодзей з найгоршымі намерамі ці самы добрасумленны і сардэчны чалавек. Гэта як храм Божы, які адкрыты ўсякаму, гатовы прыняць усіх: «*любы можа зайсці... І ў любы час*» [1, с. 108]. Для чаго? Каб толькі выгаварыцца перад Богам, выказаць набалелае, выказаць усё тое, што не дае спакою, «з'ядаючы» знутры, прымушаючы думаць і шукаць ісціну, якая сама па сабе не можа зрабіць шчаслівейшым, лепшым, чысцейшым... І толькі? Вядома, душа патрабуе выгаварыцца, выліць боль, скінуць цяжар пакут. Вуснамі аднаго з персанажаў драмы сцвярджаецца гэтая неабходнасць: «*Кожнаму чалавеку патрэбна споведзь – як святло, як вада, як хлеб*» [1, с. 132]. Няхай чалавек і атрымае з гэтага нейкае ачышчэнне ці то прабачэнне. Галоўнае ж, напэўна, што зможа пасля ён прыняць душой, зразумець, што ўратуе яго ад пакут, сумненняў і душэўнага разладу. Вось чаму адчынены дзверы кватэры Пакутовіча, дзверы, якія ніколі не замыкаюцца, – і тут не «выстаўленне» на паказ сваёй сумленнасці і далёка не эпатаж, як успрымаюць гэтую з'яву некаторыя героі п'есы. Гэта глыбокая вера ў тое, што людзі дабрэйшыя, чым падаецца на першы погляд. Гэта згадка, напамін пра тое, што «*усе людзі на зямлі святыя... Толькі забываюць пра гэта*» [1, с. 160]. Забываюць, што жывуць не дзеля таго, каб лепей жыць, а каб лепшымі быць. Гэтыя словы для А. Дударава – жыццёвае крэда, мэта і ідэал, якімі абавязаны кіравацца кожны чалавек. Заўважым, якое неадабрэнне, нават абурэнне выклікаюць у іншых герояў (Буслая, Міліцыянера) заўсёды адчыненыя дзверы кватэры Пакутовіча. Але як сумна, што гэткай жа непрымальнай з'явай усё часцей аказваюцца адчыненыя дзверы чалавечай душы, якая выпраменьвае спагаду, шкадаванне, дабрыню. «*Калі чалавек здоль-*

*ны адчуваць чужы боль, ён падыдзе, спытае, дапаможа»* [1, с. 147]. Калі ён у іншых, як у люстэрку, бачыць сябе, калі ён здольны аддаць частку сваёй цеплыні, жыць па законах сумлення і маральнай чысціні, якія не толькі становяцца складнікамі знешняй прыстойнасці, але і ўнутраным зместам, то чамусьці большасць пачынае лічыць яго нейкім ***чудзікам***. І такіх шмат. Людзі з аглухлай душой няздольныя да звычайнай спагады, шчырага праўдзівага слова. Ды і проста «аглухлай душой» унутраны змест такіх людзей назваць нельга. Вельмі трапнае словазлучэнне знайшоў для яго Дудараў: «брудная лужына», што зацвіла, памутнела, стала няздольнай лепшую частку сябе аддаваць іншым. Але на супраціў аглухлым душой жывуць, а не існуюць людзі з душой-крыніцай. Хай іх няшмат, можа нават адзінкі, аднак здольны яны на многае.

Арэолам святасці акружаны ў драме «Парог» вобраз Пакутовіча, які так і не з’явіцца перад гледачом. Яго чакаюць, ведаюць, што ён вось-вось павінен пераступіць парог кватэры і што сваім прыходам ён абавязкова прынясе ўсім збавенне. Але ён дзесьці затрымліваецца, змушаючы герояў драмы заставацца адзін на адзін з сабою, са сваімі крыўдамі і жаданнямі, хаця, напрыклад, па словах Буслая, Пакутовіч цэлую ноч «рваў» яго душу «на кавалкі». Кватэра становіцца «клінікай», своеасаблівым прытулкамдушы, якая гіне і пратэстуе адначасова супраць гэтага. Душы, якой парою дастаткова толькі позірку, ласкавага слова, каб свет вакол яе перайначыўся. Вось як пра гэта гаворыць Аліна Красоўскаму: *«Зірнуў, нават не сказаў нічога... а мяне нібы гарачай хваляй дабрыні, спагады, жаласці абдало»* [1, с. 134]. Пакутовіч сам нібы персаніфікаваная дабрата і спагада, чаго так не хапае чалавеку, *«сапраўдны інжынер чалавечых душ»* [1, с. 109], сімвал міласэрнасці, разумення чалавечых пакут. А само імя? Няўжо не сведчанне яго гатоўнасці прыняць на сябе пакуты іншых? *«Пакутовіч нібы неўпрыкмет абуджаецца і пачынае жыць унутры гэтых непрыкаяных людзей»* [2, с. 32]. Ён валодае дарам пранікнення ў самыя патаемныя куткі чалавечай душы, здольны апынуцца на хвіліну на месцы іншай асобы, нават выратаваць чалавека, а тым больш вярнуць яму раўнавагу. Гэтага ж не можа зразумець і прыняць Буслай, якому дзіўна, што яшчэ ёсць людзі, здольныя паспачуваць і прывесці з вуліцы да сябе ў кватэру «няшчаснага п’янтоса». «Апостал цара нябеснага», «чудзік», «казачнік» – так з’едліва, насмешліва названы Буслаем Пакутовіч дае сваім «пацыентам» адзіны рэцэпт – выратоўвай сваю душу. Але чаму ж яго парада, аднолькавая для людзей, абсалютна розных, з рознай жыццёвай гісторыяй, прыводзіць іх да ператварэння ў «жывых мёртвых»? Мы выразна бачым, што Буслай адзінае выратаванне бачыць у бутэльцы, Аліна ледзь не скочваецца да жыцця прастытуткі, Драгун, выпадкова апынуўшыся за парогам бездухоўнасці, сам пачынае акунацца ў бруд. І ўсё ж, не знешняя розніца звяла разам гэтых людзей, а прычынай таму чалавечая бяда, якая ахапіла цэлае грамадства. Іншая справа, што не кожны з іх здольны змагацца з ёю, што не ўсім дадзена пераступіць парог кватэры Пакутовіча і ўхапіцца за выратавальнае «кола», прапанаванае пісьменнікам А. Дударавым. Няма ўпэўненасці, напрыклад, што Андрэй Буслай зможа жыць паводле Пакутовіча, вобраз якога асацыіруецца з казачнікам-чараўніком, здольным пераўтварыць нават самыя горшыя рэчы ў дабро, а атмасферу адмоўнага – у чалавечую цеплыню і спагадлівасць.

*«У гэтай кватэры розныя дзіўныя рэчы вырабляюцца»,* – так двухсэнсоўна скажа Міліцыянер, завітаўшы да Пакутовіча [1, с. 153]. Сапраўды дзіўныя, як дзіўная, незвычайная, загадкавая і сама асоба Пакутовіча, якога аўтар нам не дае магчымасці ўбачыць. Чым займаецца гэты патаемны герой? Ён піша казкі. Але чаму менавіта казкі? (Гэтае пытанне гучыць з вуснаў Буслая). Хіба патрэбна чалавеку чыясьці хлусня? Чаму чалавеку часам больш даспадобы не праўда рэчаіснасці, а добрая казка, здольная вылечыць ці перавыхаваць. Аліна, трымаючы ў руках новы нумар часопіса з чарговым творам Пакутовіча, з уздыхам прагаворвае: *«Казка... Добрая казка»* [1, с. 116]. Казка Пакутовіча апелюе і да герояў драмы, і да гледача з чытачом: жыві па законах маралі, ду-

шэўнай чысціні і справядлівасці. Што ж уяўляюць сабой казкі Пакутовіча? Як гаворыць Драгун, *«ён піша казкі пра людзей»* [1, с. 144]. Яго герой – чалавек, якому ўласціва ўсё чалавечае: ён адчувае і спачувае, бярэ з жыцця, але аддае ў шмат разоў болей. Душа яго не «брудная лужына», а жыватворная крыніца. Казка, на яго думку, – навука і лекі ад бездухоўнасці. Яна раскрывае вочы і прымушае задумацца, убачыць сябе ў зусім іншым, нязвыклым святле. Казка – хутчэй адлюстраванне мізэрнасці і велічы чалавека адначасова. Пакутовіч упэўнены ў добрай прыродзе чалавека, якая дазваляе яму ўзняцца над дробязямі жыцця і не паддавацца грахоўнай сутнасці зямнога.

Сустракаючыся з тым, што павінна быць, і адчуваючы, што ён ёсць на самай справе, чалавек пачынае разумець тупіковасць свайго існавання, неабходнасць пошукаў шляхоў да выйсця. Ды шукае, а не знаходзіць, дакладней – не ў стане знайсці, ад чаго і пакутуе. Менавіта ў такім становішчы і апынуўся Буслай. Вось чаму ён і не можа прыняць гэтую праўду, пратэстуючы супраць яе, выказваючы ў душэўнай роспачы Драгуну: *«Я табе па мордзе гэтай рукой дам... Табе і твайму гаспадару»* [1, с. 150].

За што? За праўду, горкую, ненавісную, цяжкую. Гэтую ісціну не кожны здольны прыняць душой. Аказваецца, што і праўдай не заўсёды можна вылечыць душу чалавека, паколькі не кожны ў стане вытрымаць яе і крушэнне сваіх далёкіх ад рэчаіснасці ўяўленняў і мар. Менавіта таму Пакутовіч стварае казку – у нейкім сэнсе падман, каб не рэзаць-секчы адразу праўду ў вочы, а прыфарбаваць яе, зрабіць мякчэйшай, узрыхліць глебу душы для прыняцця праўды. І калі гэтая глеба акажацца падрыхтаванай, то абавязкова дасць свае парасткі. І ў першую чаргу – парасткі дабрыні. Пакутовіч – гаспадар кватэры, у якой знайшлі прытулак «слабыя душы». Знясіленыя, але не страціўшыя надзеі на выратаванне, яны амаль што з ахвотай ідуць па шляху, на які іх скіроўвае Пакутовіч. Але што гэта за шлях? Шлях добрай хлусні і фантазіі, якія не стасуюцца з рэчаіснасцю? «А гэтым людзям патрэбна, каб казачнае і рэальнае, мара аб дабрабыце і рэальным дабры сталіся яваю, зліліся. Усё гэта не так проста, нават і для Пакутовіча, вобраз якога падкрэслівае драматызм склаўшагася канфліктнага стану» [2, с. 33].

Ды моц Пакутовіча ў тым, што ён верыць у чалавека, хоць апошні і слабы, і мізэрны. Гэтая вера гучыць у яго казках, якія сцвярджаюць магчымасць выратавання. І перш чым змяніць знешнія абставіны, чалавек мусіць глянуць, нібы праз павелічальнае шкло, на самога сябе. Ролю гэтага павелічальнага шкла здольны выканаць казкі Пакутовіча і сам спосаб яго жыцця. Такім чынам, Пакутовіч скіроўвае кожнага, хто аказваецца ля яго, на шлях да маральнай дасканаласці. «Але хто ж ён такі, Пакутовіч? Што мы ведаем пра яго, апроч расказаў ягоных “пацыентаў”, пераказаў афарызмаў ды мудрых парад, якія прыпісваюцца гэтаму пісьменніку? І што значыць жыць “па Пакутовічу”»? [2, с. 32]. Прамога адказу на гэтыя пытанні драматург не дае. Падаюцца ж яны праз змены, што па нарастаючай адбываюцца з героямі. Гэта змены ў адносінах да сябе і астатніх, да жыцця ўвогуле. І вось тут важна зразумець: прыслухацца да парад Пакутовіча, жыць «па Пакутовічу» – не значыць абсталяваць сваю кватэру, нібы хату ў вёсцы: простая мэбля, вышываны ручнік на сцяне ды яшчэ і адчыненыя дзверы. У логіцы жыцця казачніка больш глыбінны сэнс. І гэта ёсць дабро, не як падарунак, а рэальная духоўная праца.

Цікавую дэталь уносіць у вобраз Пакутовіча аўтар драмы, калі ўпершыню гучыць яго прозвішча з вуснаў Аліны. Але як? Шэптам… Нібы пра нешта высокае, святое, неспасцігальнае, усемагутнае. Алініна паэтычнае пачуццё нейкага незразумелага Буслаю захаплення ці то Драгунова вызначэнне (*«лёгка з ім, як у маленстве з маці»* [1, с. 155]) падкрэсліваюць выключнасць характару Пакутовіча, яго прыцягальнасць. Аліне хапіла толькі слова, і яна пайшла ўслед за Пакутовічам. Не менш важная і яшчэ адна асаблівасць гэтай драмы А. Дударава – чаканне прыходу гаспадара кватэры. Заканамерна ўзнікае меркаванне: аўтар, мабыць, спецыяльна не спяшаецца выводзіць на сцэну гэтага добрага чараўніка, які «выратоўвае дарослых дзяцей ад саміх сябе», бо наўрад

ці Аляксей Дудараў здолеў бы псіхалагічна напоўніць гэты вобраз [3, с. 198]. Варта ўсё ж такі будзе прыслухацца да некаторых даследчыкаў у поглядзе на Пакутовіча. «Немагчыма не ўбачыць вядомую двaістасць гэтага вобраза, несупадзенне яго прызначэння і матэрыяльнага існавання. Нездарма Буслай западозрыў нейкую карысць і крывадушнасць, убачыўшы хату Пакутовіча. Сапраўды, гарадская кватэра, а «падроблена» пад вясковую хату: ручнікі і фотаздымкі ў рамках на сценах, простыя шпалеры, ходзікі з птушачкай. А ў акно зірнеш – дзевяты паверх. Дзверы не запіраюцца, нават замкоў няма, але, па словах Аліны, «ён грошы дома не трымае». Чаго ж запіраць, калі ў кватэры адно ламачча? Усё па-сялянску проста, але выпадкова стукнуў Буслай па сцяне, – і адчыніўся замаскіраваны бар з іншаземнымі напіткамі і зіхоткімі чарачкамі. Вось і зразумей: дзе тут падробнае, а дзе – сапраўднае. Ва ўсякім разе вобраз Пакутовіча – не лепшае стварэнне А. Дударава» [4, с. 29].

А вось яшчэ адна думка: «Калі ў доме, акрамя пабітай друкавальнай машынкі і тэлевізара, які «не ўключаюць», нічога няма – ці жыве тут «пісьменнік Пакутовіч»? Ці ён жыве ў другім месцы, а тут праводзіць досled. Так, магчыма, нездарма ж ён так і не з'яўляецца на сцэне, гэты міфічны дабрадзей, які рызыкуе рабіць людзям бескарыслівае дабро» [5, с. 194]. З другога боку, абвінавачваючы Дударава ў пазасцэнічным існаванні пісьменніка Пакутовіча, іншыя крытыкі вельмі станоўча ацэньваюць гэты вобраз: «Пакутовіч успрымаецца як чыста пазасюжэтны вобраз, а ён жа выконвае рашаючую ролю ў перараджэнні Буслая. Пагэтаму вобраз пісьменніка – сімвал выражэння місіі літаратуры, культуры, якой суджана быць у авангардзе духоўных пошукаў чалавека, бо казкі Пакутовіча – не што іншае, як яго жаданне бачыць людзей у іх першароднаснай чысціні» [6, с. 110]. Падобнай думкі трымаецца і Г. Сачанка: «Вобраз пісьменніка нагадвае пра высокую місію мастацтва ў нашым жыцці. Ідэалізаваны, недасягальны, герой так і не з'яўляецца на сцэне» [7, с. 145].

Палеміку наконт гэтага вобраза можна весці доўга, але, думаецца, найбольш цікава ў гэтым плане выказаўся П. Васючэнка: «Пакутовіч не жыве як звычайны чалавек, але існуе як сімвал, як умоўнае абазначэнне дабраты, міласэрнасці, разумення чалавечых пакут. Тых элементарных і патрэбных чалавечых пачуццяў, якіх бракуе Буслаю і яго акружэнню. Бо Пакутовіч неўпрыкмет абуджаецца і пачынае жыць унутры гэтых непрыкметных людзей» [8, с. 32]. «Часцей за ўсё ўражанне арыгінальнасці А. Дудараў дасягае зменай ракурсаў асвятлення той ці іншай праблемы, таго ці іншага чалавечага тыпу. Так, у яго «Парозе» з'яўляецца вобраз Андрэя Буслая, алкаголіка-філосафа, які ў самых дрымучых нетрах сацыяльнага зла ўмудраецца заставацца больш чыстым, разумным і высакародным, чым многія яго рэспектабельныя суграмадзяне» [9, с. 69].

Гэта як чаканне новага прышэсця Хрыста, вестку аб якім прымаюць усе, але нікому не дадзена ведаць, калі гэта здарыцца. Людзі чакаюць і разам з тым цешаць сябе надзеяй на выратаванне. Па гэтай прычыне аўтар п'есы не проста імкнецца прывесці свайго героя, і не толькі яго, да споведзі, а вымушае іх у першую чаргу прааналізаваць сваё жыццё, каб разабрацца ў прычынах свайго становішча. Калі са шкадаваннем сотні разоў паўтаралі Буслаю: «Кінь піць! Не губі сябе! У цябе ж сям'я! Ты ж на чалавека не падобны», – то прызнавалі яго толькі як алкаголіка. А вось Пакутовіч ні разу не звярнуўся да яго з такімі словамі. Ён паважае ўсіх людзей, перад ім усе роўныя.

Буслай, як і астатнія, пачуў, што пачынаць трэба з душы. Але што рабіць у канкрэтным, не казачным жыцці – ён забыўся. Забыўся на дабрыню і дараванне, якія душу лепшай, чысцейшай робяць. А гэта не што іншае, як складнікі мудрасці, сугучнай з разуменнем жыццёвай сутнасці, якой яе бычыць Пакутовіч. Але ці не занадта фантастычным можа паказацца імкненне да такога «раю на грэшнай зямлі», калі чалавек пераможа ўсе свае ўнутраныя недахопы і найперш звернецца да духоўных патрэб? Усё гэта можа здацца вельмі далёкім. Але тым самым ён, Пакутовіч, і, зразумела, драматург,

сцвярджае: няхай духоўная гармонія будзе той мэтай, да якой павінен імкнуцца кожны з нас. І чым вышэй мэта, тым больш у нас, людзях, яна будзе абуджаць і сіл, і розуму, і ўнутранай прыгажосці. Мэтаю свайго ўласнага жыцця Пакутовіч і бачыць выратаванне чалавечай душы, імкненне ўзняць чалавека з самага дна жыццёвага рэчышча да ўсведамлення свайго становішча і пераадолення негатыву. Дзякуючы Пакутовічу, Буслаю ў поўнай ступені адкрываецца трагізм яго становішча. Зусім іншым паўстае перад намі Красоўскі – таксама з галерэі «мерцвякоў», хоць маральная дэградацыя ў ім як бы хаваецца, маскіруецца. Красоўскі з такога асяроддзя, дзе ў дамінанту ўзведзена толькі свая правата, правата ва ўсім: у словах, учынках, ладзе жыцця. Бо ўсё, што ён ні робіць, робіць «па тэорыі» і аб ніякай супярэчнасці становішча нават думкі не дапускае. Якія тут могуць быць размовы? Усё згладжана. Ніякіх лішніх, непатрэбных, з яго пункту погляду, учынкаў, пачуццяў. Таму ён і спрабуе вырваць Аліну са свету. *«Цяпла. Чалавечнасці. Веры»* [1, с. 133], са свету самаго Пакутовіча, дзе яна *«душу падлячыла»* [1, с. 130].

Аліна знаходзіць у Пакутовічу тое, чаго не маглі даць ёй муж і асяродак, які і рабіў яе такой жа чэрствай, «мёртвай душой». Пра Пакутовіча яна гаворыць: *«Я – звычайная, а ён святы»* [1, с. 109], а яго твор для Аліны *«казка, добрая казка»* [1, с. 112]. Найбольш відавочна, шчыра з усіх герояў «Парога» затаптаная і апляваная Алініна душа цягнецца да святла, дабрыні, жывіцца імі – спагадлівым словам, ласкавым позіркам... Яна «ачышчае» сябе, сапраўды працуе над сабой. Менавіта Аліне ў большай ступені, чым іншым Пакутовічавым «пацыентам», удаецца наблізіцца да важнейшых яго ісцін, вартасцей: дабра, веры, надзеі, любові, – а гэта значыць, і святасці Пакутовіча. Як жа і чым выратоўваецца гераіня? Як змагла перакрэсліць у памяці тое, што прыйшлося вытрымаць і да чаго прызвычаілася, здзекуючыся з сябе? Яна прабачае. Не «змешвае» сваю душу са злосцю, нянавісцю, дарэмна сказаным злым словам: *«Ніколі і ні пра кага, апрач сябе, не думаць і не гаварыць блага»* [1, с. 119]. Няпростым шляхам ідзе Аліна. Цікава, што спавядаецца яна не толькі Пакутовічу, але яшчэ не каму іншаму, як Красоўскаму, які эмацыянальна замкнёны, халодны. Яго ніякім чынам не кранае прызнанне Аліны. *«Я дарую табе гэты літаратурна-драматычны ваяж»,* – так насмешліва Красоўскі акрэслівае тое, што пачуў ад Аліны [1, с. 132]. І тут ён «даруе», нібы робіць пазыку. Усё – словы, і не больш. Красоўскі не бачыць у Аліне жанчыну, якая чакае і спадзяецца на падтрымку і цеплыню, а яе знаёмства з Пакутовічам, побыт у яго кватэры разглядае не інакш, як «прыгоды»: *«Прыгоды заусёды тым і цікавыя, што яны калі-некалі канчаюцца»* [1, с. 132]. Чаго было Аліне чакаць ад чалавека, чарговы жыццёвы клопат якога – «расстарацца мяса» на чарговыя шашлыкі. Імкнучыся ж выратаваць свой маленькі свет, яна далучаецца да выратавання ўсяго чалавецтва. Бо менавіта лёсам кожнага і ўсіх вызначаецца этычны стан сусвету.

Пакутовіч яшчэ і пісьменнік. А значыць, той, каму лёсам наканавана несці праўду. А для гэтага патрэбна глыбокае разуменне чалавечай сутнасці, пранікненне ў думкі, свядомасць і ўменне без прымусу, а толькі сваёй чалавечнасцю падвесці да ісціны, якая вышэй за паўсядзённасць, звычайнае, матэрыяльнае. Не выпадкова малады Драгун з захапленнем паўтарае словы Пакутовіча: *«Аддаваць, аддаваць, адддаваць. Больш аддасі – спакайней будзеш спаць, радасней жыць, нават смерць сустрэнеш з усмешкай»* [1, с. 132].

«Казачнік» Дударава, які так і не з'яўляецца на сцэне, бачыць сваю мэту не ў самавыяўленні, а ў тым, каб цярпліва і паслядоўна дбаць у кожным чалавеку пра лепшае. Ён верыць людзям, спрабуе вылечыць іх хворыя душы. Гэта зусім не Лука з драмы Максіма Горкага «На дне» ў традыцыйным уяўленні «мякіша для бяззубых». У адрозненні ад горкаўскага персанажа Пакутовіч не проста шкадуе, не проста суцяшае, а ўсім кажа праўду, хоць яна і не да твару і балючая без меры. Гэтым самым ён сцвярджае правераныя жыццём старыя ісціны, і, як вынік, вяртае людзей да саміх сябе.

У яго кватэры, што нагадвае вясковую хату, з'яўляецца напамінам пра бацькоўскі дом, юнацтва персанажаў, калі яны жылі па натуральных мудрых законах, калі ў іх душах валадарылі шчырасць, узаемаразуменне, – у кватэры чалавека з жывымі вачамі яны пачынаюць думаць пра сябе і іншых, спавядацца перад сваім сумленнем: *«Усё жыццё як падкідыш жыву»* (Аліна) [1, с. 110]; *«Страшны не той, хто робіць дрэннае, а той, хто не можа даравацъ гэтага* (Драгун) [1, с. 156]; *«І ў мяне душа тлушчам заплыла»* (Буслай) [1, с. 128].

Заўважым, праз боль, праз балючыя ўспаміны яны прыходзяць да балючай цвярозасці, вяртаюцца да сябе ранейшых. І месца Пакутовіча ў гэтым змаганні выключнае, хаця ён персанаж і пазасцэнічны. Яго адсутнасць на сцэне як быццам пэўным чынам падкрэслівае ілюзорнасць таго шляху да міласэрнасці і дабрыні, які абралі яго «пацыенты». Не выпадкова, відаць, літаратурнае амплуа Пакутовіча – казкі. Аднак цуд чалавечага духоўнага адраджэння адбываецца не казачным шляхам, а праз рэальны боль, пакуты, пакаянне і ахвярнасць. Таму Буслай, якога Пакутовіч нанова, па крупінках імкнуўся (і шмат сіл для гэтага прыклаў) сабраць як чалавека, вярнуць яго да сына, абсалютнага даверу, будучыні, да адзінай цяпер у яго жыцці любові – да магчымасці аддаваць душэўную цеплыню, у канцы п'есы не можа ўспомніць казку, хаця да апошняга напружвае сваю памяць [8, с. 148]. Найчасцей у п'есе персанажы самі гавораць пра сябе. А якімі ж паўстаюць яны перад намі праз прызму бачання самога Пакутовіча? Пытанне не з простых, бо менавіта разуменне нормы чалавечага жыцця становіцца той прызмай. Але што гэта такое?

У вусны Маці ўкладзена ўслаўленне дару жыцця: *«Сонца свеціць – радуйцеся, дожджык зямельку палівае – радуйцеся, траўка, кветачкі растуць – радуйцеся, людцы!»* [1, с. 136]. І гэта адна з галоўных запаведзей – радавацца жыццю і прыносіць іншым шчасце і радасць. Вера ў дабрыню чалавека, створанага па вобразу і падабенстве Божым, спалучаецца ў Пакутовічу з яго ўменнем бачыць нават у самым апошнім злодзею чалавека, душа якога хоць і «зацвіла», «памутнела», «стала бруднай лужынай», але і такая мае магчымасць выратавання. Пакутовіч не выкрывае недахопы іншых, для яго найважнейшае – выявіць, што яшчэ ёсць добрага ў тым ці іншым чалавеку. Прычым імкнецца ён зрабіць гэта для таго, каб яго «пацыенты» самі адчулі ў сабе чалавечую годнасць. Таму і дапамагае ён Буслаю, Аліне, Драгуну. Яго «пацыенты» самі ідуць на своеасаблівую споведзь, якая ў нейкай меры дапамагае ім разабрацца ў сабе. І як сведчанне гэтаму – аповед Буслая, у якім ён прыгадвае «пузатага дзядзю ў магазіне», якому «не хапае мяса»: *«Ніколі не скажа, паразіт, што яму веры, мэты, чысціні не хапае. Мяса!!! Гэта цяжкасці? Абжорства! Якая ж гэта мэта?... Чаму ж мне так мутарна? Чаму ў мяне душа баліць? Ці варта ўвогуле жыць, калі шчасце чалавечае толькі ў тым, каб смачна з'есці, мець прыгожую бабу, нічога не рабіць і атрымліваць кучу грошай? Ці варта?»* [1, с. 152]. І тут, у гэтых суцэльных пытаннях, што, відаць, не патрабуюць адказу, вуснамі Буслая прамаўляе ісціна як вынік душэўных пошукаў чалавека, якія і імкнецца разбудзіць у ім Пакутовіч. Гэты маналог успрымаецца як крык душы Буслая, які дае падставы па-іншаму глянуць на гэтага персанажа п'есы.

З цяжкага становішча імкнецца Пакутовіч вывесці і Драгуна, які сутыкаецца са светам людзей, што апынуліся «на дне». Незаслужанае абвінавачанне і пакаранне кідаюць яго чыстую душу ў чалавечыя нечыстоты. Аднак не столькі несправядлівае асуджэнне яго мучае. Не можа дараваць Драгун раўнадушша, чэрствасці, бяздушша самым блізкім людзям, якія адступіліся, не зрабілі кроку насустрач, каб зразумець яго і ўпэўніцца, што ён ні ў чым не вінаваты. Пачуўшы гісторыю Драгуна, Пакутовіч і для яго знаходзіць свае метады «лячэння». Як можна жыць з такім цяжарам на душы? Жыць са страшэннай помстай і злосцю, якія трансфармуюць адмоўна самога іх носьбіта. Знайсці ў сабе сілы дараваць – вось да чаго скіроўвае Пакутовіч усіх нас, а не толькі Драгуна: *«Калі даруеш – гэта страшней за помсту»* [1, с. 155].

З развіццём сюжэта п'есы паступова выяўляецца, што ці не кожны герой пачынае мысліць, як таямнічы Пакутовіч. Атмасфера дабрыні запаўняе літаральна ўсё ў яго кватэры. Дабрынёй, спагадай пранікаюцца не толькі тыя, хто вымушана знайшоў тут сабе прытулак, а нават тыя, хто ўпершыню завітаў сюды (хіба што апроч Красоўскага). Вось, да прыкладу, яскравы дыялог Міліцыянера і Драгуна: *«Ты і сам хлопчык, я бачу, не цукровы... Шмат ад людзей патрабуеш... Трэба і ад сябе патрабаваць». – «Ну во... Дзесяць мінут пабылі ў кватэры і ўжо загаварылі, як пісьменнік Пакутовіч»* [1, с. 157]. Сапраўды, загаварыў. Значыць, дабрыня і спагада на самай справе кіруюць чалавечай душой. Аказваецца, і ў Міліцыянера нейкая «часцінка Пакутовіча» рэанімавалася. Яшчэ адна нібы ідэальная, казачная фігура, бо ён закрывае вочы на неабходнасць выканання сваіх непасрэдных абавязкаў – праверкі дакументаў. А гэты момант не можа застацца незаўважаным. Не вельмі звычайны персанаж гэты Міліцыянер.

Пазасцэнічны ж герой так і не з'яўляецца, так ні разу яго глядач і не ўбачыць. Відаць, драматург вырашыў: толькі сам чалавек здольны прыйсці да асэнсавання самога сябе. Няхай сабе з чыёйсьці падказкай, але сам. Пра высокія жыццёвыя ідэалы Пакутовіча мы даведваемся з вуснаў Буслая, Аліны, Драгуна, далёкіх пакуль што на самай справе ад іх: *«Прабачце спачатку самому сабе. Астатнія вам даруюць»* [1, с. 135]; *«Людзі жывуць не дзеля таго, каб лепей жыць, а каб лепей быць»* [1, с. 152]; *«Любоў, давер, спагада, глыбокая сумленнасць уратуюць ад пакут, сумненняў і душэўнага разладу»* [1, с. 132]. Ды ў прамоўленым чуецца голас найперш Пакутовіча, і светлая энергетыка яго перакананняў ужо працуе ў душах герояў твора. На працягу ўсёй п'есы «Парог» адбываецца апасродкаванае выхаванне мастацка-эстэтычнымі сродкамі. Драматург А. Дудараў апелюе да вечных маральна-этычных каштоўнасцей, дасягаючы выразнага катарсічнага эфекту.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Дудараў, А.А. Дыялог : п'есы / А.А. Дудараў. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 272 с.
2. Васючэнка, П.В. Драматургія і час / П.В. Васючэнка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 143 с.
3. Емельянов, Б.В. Баловень века / Б.В. Емельянов // Современная драматургия. – 1984. – № 3. – С. 190–204.
4. Няфагіна, Г. Драма маральных пазіцый. Характары і канфлікты драматургіі Аляксея Дударава / Г. Няфагіна // Бел. мова і літ. у школе. – 1989. – № 2. – С. 26–32.
5. Аннинский, Л.А. Шалости сфинкса / Л.А. Аннинский // Современная драматургия. –1983. – № 2. – С. 189–201.
6. Аксёнчык, Н.К. На высакародным шляху адраджэння (пра п'есу А. Дударава «Парог») / Н.К. Аксёнчык // Бел. літ. : рэсп. межвед. зб. – Мінск, 1988. – Вып. 16. – С. 102–113.
7. Сачанка, Г. «Як агонь, як вада, як хлеб…» / Г. Сачанка / Маладосць. – 1987. – № 5. – С. 140–150.
8. Васючэнка, П.В. Сучасная беларуская драматургія / П.В. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 158 с.
9. Лаўшук, С.С. Драматургія / С.С. Лаўшук // Гісторыя бел. літ. XX ст. : у 4 т. – 1966–1985 / НАН Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – Т. 4, кн. 1. – 928 с.



***Malyavka P.I.*** **Spiritual Catharsis of the Character in the Alexey Dudarev's play «Threshold»**

The temper of the characters of the Alexey Dudarev's play «Threshold» are analyzed in the article through the prism of the artistic and aesthetic outlook. The attention is focused on their «difficult» role and place, especially in relation to the main character of the drama in the process of the spiritual catharsis on the way to a significant and internally rich Person.


Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.01.2014